УДК 78(082)
ББК 85.31
А43

*Печатается по решению редакционно-издательского совета
УО «МГУ им. А.А. Кулешова»*

**Редакционный совет:**
***Г.В. Ананченко,*** кандидат педагогических наук, профессор (Беларусь);
***Б.О. Голешевич,*** кандидат педагогических наук, доцент (Беларусь);
***В.Ф. Иванов,*** доктор искусствоведения, профессор (Украина);
***Г.В. Локарева,*** доктор педагогических наук, профессор (Украина);
***О.П. Морозова,*** кандидат искусствоведения, доцент (Беларусь);
***В.П. Рева,*** кандидат педагогических наук, доцент (Беларусь);
***М.Р. Черная,*** доктор искусствоведения, профессор (Россия)

**Актуальные проблемы педагогики искусства**: материалы
А43 второй Международной научно-практической конференции (22-23 апреля 2010 г.). – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010. – 284 с.: ил.

ISBN 978-985-480-644-0.

В материалах конференции освещаются вопросы общего музыкального образования, подготовки студентов в вузе, преподавания музыки в общеобразовательных школах и педагогических колледжах.

Издание адресовано преподавателям, студентам, научным работникам, аспирантам.

**УДК 78(082)**
**ББК 85.31**

**ISBN 978-985-480-644-0** © Оформление. УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010

утере самой дисциплины, панибратству между учениками и преподавателями, размыванию содержания образовательного процесса. Здесь мы видим, прежде всего, стремление справиться с существующими проблемами с помощью чисто внешних приемов. Так, педагоги, а вслед за ними и студенты-практиканты зачастую чрезмерно увлекаются игровыми методами, превращая их на деле в заигрывание, где они, не соответствуя содержанию, превращаются в пародию педагогического процесса на самого себя. Глубинное понимание педагогики сотрудничества и дисциплинарной модели педагогического процесса не является альтернативой. По сути они представляют взаимосвязанное единство, что подтверждает и анализ лучших отечественных традиций организации учебно-воспитательного процесса. Мы понимаем педагогику сотрудничества как диалогически дисциплинарную модель обучения, осмысление которой способствует переосмыслению содержания музыки как искусства, обусловленного установками слуха, через который вливается красота мира и присутствие человека в нем.

**Литература**


1. Александрийский, Климент. Педагог / Климент Александрийский – Ярославль,1980. – 520 с.
2. Евангелие. 1 Кор. 14:20.
3. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1986. – 445 с.


ПОГАШЕНО
624594
Научно-педагогическая библиотека учреждения «Главный информационно-аналитический центр Министерства образования Республики Беларусь»

*Ю.Ю. Захарына (Мінск)*

## МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ СУЧАСНАЙ АРХІТЭКТУРЫ Ў КУРСЕ "СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА" Ў ВНУ

Праблема выбару метадалагічнага падыходу пры асвятленні і раскрыцці аспектаў той ці іншай навукі матывавана сукупнасцю прычын. Сярод іх – рацыянальнасць, хуткасць і правільнасць вырашэння пастаўленых задач; мінімізацыя дапаможных метадаў і прыёмаў, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні дадатковых метадалагічных аперацый і прыцягваюцца з мэтай канкрэтызацыі, удакладнення, вызначэння паралелей і аналогій; даступнасць успрымання рэцыпіентамі як саміх метадалагічных аперацый, так і іх вынікаў.

Асабліва востра адзначаная праблема вылучылася ў апошнія дзесяцігоддзі і праявілася ў сферы гуманітарных навук. Інтэнсіўныя тэмпы развіцця сучаснай навукі і тэхнікі, глабалізацыя і інфарматызацыя культу-

БИБЛИОТЕКА БГПУ
ИНВ. № 1739442

ры вызначылі перадумовы перагляду метадалагічных падыходаў да вы рашэння навуковых і практычных задач.

У галіне гуманітарных навук праблема пошуку аптымальнага мета далагічнага падыходу атрымала адлюстраванне ў педагагічным працэсе ВНУ, знайшла яскравы выраз пры вывучэнні асаблівасцей сучаснага мастацтва. Мастацкая культура, і архітэктура ў прыватнасці, плюралі стычна. Вялікі ўплыў на шматграннасць і разнастайнасць вобразных ха рактарыстык мастацкай культуры апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст аказаў постмадэрн, які выразна ўвасобіўся ў архітэктуры і значна ўзба гаціў яе мастацкую мову. Акрамя постмадэрна, архітэктура зведала ўплыў найноўшых мастацкіх плыняў рэтраспектыўнага і авангарднага кірунка – неамадэрнізму, неарацыяналізму, хай-тэку, якія то суіснавалі пара лельна, то зліваліся, перапляталіся і дадавалі адзін аднаго. У выніку ў ёй увасобіліся рознастылёвыя мастацка-вобразныя праявы. Гэта ў значнай ступені абумовіла цяжкасць яе стылявой інтэрпрэтацыі – пануючай у мастацтвазнаўстве Беларусі і найбольш прымальнай для раскрыцця ад метных асаблівасцей мастацтва гістарычных эпох у курсе “Сусветная мастацкая культура” ў ВНУ і запатрабавала перагляду з улікам нава тарскіх метадалагічных падыходаў.

Метадалагічная разнастайнасць інтэрпрэтацый мастацкага вобраза сучаснай архітэктуры стала вынікам адлюстравання распаўсюджанага у Заходняй Еўропе міждысцыплінарнага падыходу і прынцыпа інтэграцыі ведаў з прыцягненнем тэорый і канцэпцый філасофіі, эстэтыкі, мастацтвазнаўства, культуралогіі, педагогікі, сацыялогіі і іншых навук. Гэта значна пашырыла сістэму метадалагічных падыходаў да вывучэння сучаснай архітэктуры ў курсе “Сусветная мастацкая культура” ў ВНУ, у якой знайшлі ўжыванне фенаменалагічны, семіятычны, аксіяналічны, герменеўтычны, структуралісцкі падыходы.

*Фенаменалагічны падыход*, распрацаваны нямецкімі філосафамі XX ст. Э. Гусэрлем, М. Хайдэгерам, заснаваны на інтэрпрэтацыі не самога прадмета, а яго асаблівасцей. Вывучэнне сучаснай архітэктуры на аснове фенаменалагічнага падыходу звязана з эмацыянальна-ацэначнай характарыстыкай яе мастацкага вобраза і спрыяе эстэтычнаму выхаванню студэнтаў. Але пры такім падыходзе ўвага скіроўваецца на знешнія праявы мастацкага вобраза, пры гэтым “унутраныя”, сутнасныя характарыстыкі дойлідства застаюцца нераскрытымі няпоўнасцю. Адным з адгалінаванняў фенаменалагічнага падыходу з’яўляецца *эйдалагічны* як канструяванне эйдаса (вобраза) з яго асобных частак, вылучаных А. Лосевым у т. зв. “тэтрактыду”: сутнасная (адзінкавае), пакой, рух, тоеснасць, адрозненне [1, с. 14]. Эйдалагічны падыход прадугледжвае ўжыванне ў якасці дапаможнага прыёма параўнанне з аналагічнымі ўзорамі. У адпаведнасці з ім у архітэктурным аб’екце вылуча-



юцца адметныя асаблівасці мастацкага вобраза, якія характарызуюць яго з пункту гледжання эстэтычных якасцей: статычнасць або дынамічнасць, узвышанасць або цяжкасць форм, празрыстасць або брутальнасць.

*Семіятычны падыход*, прапанаваны амерыканскім філосафам другой паловы XIX – пачатку XX ст. Ч.С. Пірсам, выкарыстоўваецца з мэтай вывучэння ўтварэння, будовы і функцыяніравання знакавых сістэм. Семіятычны падыход трактуе мастацкі вобраз у двух узроўнях: дэнататыўным як фактычнае паведамленне і канататыўным як дадатковае паведамленне з сімвалічнай нагрузкай. Інтэрпрэтацыя сучаснай архітэктуры на аснове семіятычнага падыходу грунтуецца на сэнсавым значэнні знакаў як вобразаў аб’ектаў. Яго выкарыстанне ў педагагічным працэсе спрыяе развіццю абстрактна-вобразнага мыслення і ўяўлення рэцыпіентаў. Архітэктурныя аб’екты атаясамліваюцца з сімваламі і разглядаюцца як метафары, асацыяцыі, пачуццёвыя і эмацыянальныя з’явы, якія ў наглядна-вобразнай форме прадстаўляюць абстрактныя ідэі і паняцці [2, с. 27].

Вывучэнне мастацтва на аснове інтэрпрэтацый знакаў і сімвалаў уласціва не толькі семіятычнаму падыходу, але і *аксіялагічнаму*, накіраванаму на вывучэнне каштоўнасцей як сэнсаутваральных асноў чалавечага быцця. Яны задаюць накіраванасць і матываванасць чалавечай дзейнасці, дзеянняў і ўчынкаў.

Вылучаны філосафам XIX ст. Р. Лотцэ аксіялагічны падыход у працэсе эвалюцыі зведаў значныя змены. На яго аснове ў канцы XIX ст. нямецкі філосаф В. Дзільтэй прапанаваў тэорыю мноства раўнапраўных каштоўнасных сістэм, якія вызначаюцца з дапамогай гістарычнага метаду. Яго тэорыя “аксіялагічнага плюралізму” атрымала падтрымку ў XX ст. у вучэннях У. Эко, А. Усманавай, А. Белага, якія развівалі т. зв. “тэорыю сімвалізма”. Пры вывучэнне сучаснай архітэктуры на аснове аксіялагічнага падыходу, прадстаўленага У. Эко, мае месца вылучэнне архітэктурных кодаў – сінтаксічных (адсылаюць да тэхнікі будаўніцтва: бэлькі, перакрыцці, аркі) і семантычных (адсылаюць да архітэктурных элементаў – акно, купал, калона або да тыпаў збудаванняў – сацыяльных, прасторавых), – якія дапамагаюць зразумець эстэтычную, імператыўную, эматыўную, фактычную, металінгвістычную сутнасць мастацкага вобраза архітэктуры [3, с. 213, 232–233].

*Герменеўтычны падыход* да вывучэння сучаснай архітэктуры непасрэдна звязаны з выяўленнем умоў асэнсавання яе ролі ў соцыуме. Уведзены ў навуковы зварот нямецкім філосафам другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. Ф. Шлеермахерам герменеўтычны падыход дае магчымасць фіксацыі змястоўнага і фармальнага ў архітэктуры, на аснове чаго ўзнаўляецца творчая задума дойліда. У якасці дапаможнага прынцыпа можа выкарыстоўвацца т. зв. “герменеўтычны круг”, пры якім часткі (элементы) вылучаюцца з цэлага, а сутнасць выводзіцца з частак.

Сутнасць *структуралісцкага падыходу*, распрацаванага К. Леві-Стросам, Ж. Лаканам, Ж. Дэрыдой, М. Фуко, Ж. Бадрыярам, Ж. Дзелезам, Ю. Лотманам у XX ст., заключана ў выяўленні інварыянтных адносінаў ці структур у дынаміцы разнастайных сістэм. Апора на структуралісцкі падыход пры вывучэнні сучаснай архітэктуры дазваляе класіфікаваць будынкі і збудаванні. У якасці метадаў навуковага пазнання структуралісцкі падыход выкарыстоўвае тыпалагізацыю, схематызацыю, абстрагіраванне. Так, на аснове структуралісцкага метаду будынкі можна класіфікаваць па канструктыўна-тыпалагічнай прыкмеце на каркасныя, V-падобныя апоры, прасторавыя нясучыя канструкцыі [4]. Выкарыстанне такога падыходу на занятках па "Сусветнай мастацкай культуры" спрыяе развіццю абстрактна-лагічнага мыслення студэнтаў.

Такім чынам, кожны з метадалагічных падыходаў да вывучэння сучаснай архітэктуры ў курсе "Сусветная мастацкая культура" ў ВНУ мае сваю спецыфіку і спрыяе эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, развіццю мыслення, уяўлення. Але найбольш даступнымі для ўспрымання з'яўляюцца структуралісцкі і аксіялагічны падыходы.

**Літаратура**


1. Лосев, А.Ф. Диалектика художественной формы / А.Ф. Лосев. – М.: Изд-во автора, 1927. – 252 с.
2. Мантанов, В.В. Образ, знак, условность / В.В. Мантанов. – М.: Высшая школа, 1980. – 160 с.
3. Эко, У. Отсутствующая структура. Введение в семиологию / У. Эко; пер. А.Г. Погоняйло, В.Г. Резник; ред. М.Г. Ермакова. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1998. – 432 с.
4. Зигель, К. Структура и форма в современной архитектуре / К. Зигель. – М.: Стройиздат, 1965. – 267 с.



*В.Ф. Иванов (Николаев)*


## ПРОБЛЕМЫ ДРЕВНЕРУССКОЙ МУЗЫКАЛЬНОЙ ПЕДАГОГИКИ В КОНТЕКСТЕ ЗНАМЕННО-КОНДАКАРНОЙ КУЛЬТУРЫ

Появление в IX в. на политической карте Европы Киевской Руси знаменовало оригинальную ветвь христианской идеологии – православие с его образовательным развитием, просветительным движением и обрядовыми традициями. На этом историческом фоне актуальным представляется научный интерес педагогики и искусствоведения к мало изученным вопросам певческой знаменно-кондакарной культуры. Методо-